— аффи́нное	прасто́ра афі́нная
— ба́нахово	прасто́ра ба́нахава
— Ба́наха	прасто́ра Ба́наха
— бесконе́чномерное	прасто́ра бяско́нцамерная
— биокомпа́ктное	прасто́ра бікампа́ктная
— биве́кторное	прасто́ра біве́ктарная
— биплана́рное	прасто́ра біплана́рная
— бисвя́зное	прасто́ра бізвя́зная
— бли́зости	прасто́ра блі́зкасці
— Бо́ра	прасто́ра Бо́ра
— борнологи́ческое	прасто́ра борналагі́чная
— бо́чечное	прасто́ра бо́чкавая
— Бра́уэра	прасто́ра Бра́ўэра
— Брело́	прасто́ра Брэло́
— Бэ́ра	прасто́ра Бэ́ра
— ве́кторное	прасто́ра ве́ктарная
— вероя́тностное	прасто́ра імаве́рнасная
— весово́е	прасто́ра ва́гавая
— волокни́стое	прасто́ра валакні́стая
— вы́борки	прасто́ра вы́баркі
— вы́борочное	прасто́ра вы́баркавая
— вы́пукло-во́гнутое	прасто́ра вы́пукла-ўвагну́тая
— галиле́ево	прасто́ра галіле́ева

простра́нство гармони́ческое	прасто́ра гармані́чная
— гёльдерово	прасто́ра гёльдэрава
— Ги́льберта	прасто́ра Гі́льберта (Хі́льберта)
— ги́льбертово	прасто́ра гі́льбертава
— гиперболи́ческое	прасто́ра гіпербалі́чная
— гла́дкое	прасто́ра гла́дкая
— Гри́на	прасто́ра Гры́на
— да́нтово	прасто́ра да́нтава
— дверно́е	прасто́ра дзвярна́я
— дво́йственное	прасто́ра дваі́стая
— деза́ргово	прасто́ра дэза́ргава
— дефе́ктное	прасто́ра дэфе́ктная
— диади́ческое	прасто́ра дыады́чная
— дискре́тное	прасто́ра дыскрэ́тная
— диспе́рсное	прасто́ра дыспе́рсная
— додека́эдра	прасто́ра дадэка́эдра
— дополни́тельное	прасто́ра дадатко́вая
— достижи́мое	прасто́ра дасяга́льная
— дуа́льное	прасто́ра дуа́льная
— евкли́дово	прасто́ра эўклі́дава
— запо́лненное	прасто́ра запо́ўненая
— измери́мое	прасто́ра вымяра́льная
— изометри́чное	прасто́ра ізаметры́чная
— изотро́пное	прасто́ра ізатро́пная
— икоса́эдра	прасто́ра ікаса́эдра
— интерполяцио́нное	прасто́ра інтэрпаляцы́йная
— инфрабо́чечное	прасто́ра інфрабо́чкавая
— Кавагу́ти	прасто́ра Кавагу́ці
— Канторо́вича	прасто́ра Кантаро́віча
— каса́тельное	прасто́ра даты́чная
— квазигиперболи́ческое	прасто́ра квазігіпербалі́чная
— квазидуа́льное	прасто́ра квазідуа́льная
— квазиевкли́дово	прасто́ра квазіеўклі́дава
— квазикомпа́ктное	прасто́ра квазікампа́ктная
— квазинорма́льное	прасто́ра квазінарма́льная
— квазинорми́рованное	прасто́ра квазіўнармава́ная
— квазиравноме́рно вы́пуклое	прасто́ра квазіраўнаме́рна вы́пуклая
— квазисимплекти́ческое	прасто́ра квазісімплекты́чная
— квазиэллипти́ческое	прасто́ра квазіэліпты́чная
— Кёте́	прасто́ра Кётэ́
— классифици́рующее	прасто́ра класіфікава́льная
— Кле́йна	прасто́ра Кле́йна
— кле́точное	прасто́ра кле́ткавая

простра́нство коевкли́дово	прасто́ра каэўклі́дава
— кокаса́тельное	прасто́ра кадаты́чная
— Колмого́рова	прасто́ра Калмаго́рава
— компа́ктное комплéксное	прасто́ра кампа́ктная камплéксная
— конечномéрное	прасто́ра канечнамéрная
— конфигура́ций	прасто́ра канфігура́цый
— конфигурацио́нное	прасто́ра канфігурацы́йная
— конфо́рмное	прасто́ра канфо́рмная
— конфо́рмно-евкли́дово	прасто́ра канфо́рмна-эўклі́дава
— координа́тное	прасто́ра каардына́тная
— копсевдогалилéево	прасто́ра капсеўдагалілéева
— копсевдоевкли́дово	прасто́ра капсеўдаэўклі́дава
— коэффициéнтов	прасто́ра каэфіцыéнтаў
— Курани́си	прасто́ра Кураніс́і
— лакуна́рное	прасто́ра лакуна́рная
— лакуна́рности	прасто́ра лакуна́рнасці
— Лебéга	прасто́ра Лебéга
— Линделёфа	прасто́ра Ліндэлёфа
— линéйное	прасто́ра лінéйная
— ли́нзовое	прасто́ра лі́нзавая
— Лобачéвского	прасто́ра Лабачэ́ўскага
— Лу́зина	прасто́ра Лу́зіна
— Ма́кки	прасто́ра Ма́кі
— Ма́ртина	прасто́ра Ма́ртына
— Марцинкéвича	прасто́ра Марцінкéвіча
— метризу́емое	прасто́ра метрызава́льная
— метри́ческое	прасто́ра метры́чная
— Минко́вского	прасто́ра Мінко́ўскага
— мо́дулей	прасто́ра мо́дуляў
— модуля́рное	прасто́ра мадуля́рная
— Монтéля	прасто́ра Мантэ́ля
— мультиги́льбертово	прасто́ра мультыгі́льбертава
— Му́ра	прасто́ра Му́ра
— накрыва́ющее	прасто́ра накрыва́льная
— направлéний	прасто́ра напра́мкаў
— неатоми́ческое	прасто́ра неатамі́чная
— неевкли́дово	прасто́ра неэўклі́дава
— непреры́вное	прасто́ра непары́ўная
— неприводи́мое	прасто́ра непрыво́дная
— неразложи́мое	прасто́ра нерасклада́льная
— несвя́зное	прасто́ра нязвя́зная
— нётерово	прасто́ра нётэрава
— Нико́льского	прасто́ра Ніко́льскага
— норма́льное	прасто́ра нарма́льная

простра́нство норми́рованное	прасто́ра ўнармава́ная
— норми́руемое	прасто́ра нармава́льная
— нульме́рное	прасто́ра нульме́рная
— однoро́дное	прасто́ра аднаро́дная
— окольцо́ванное	прасто́ра акальцава́ная
— окта́эдра	прасто́ра акта́эдра
— орби́т	прасто́ра арбі́т
— О́рлича	прасто́ра О́рліча
— отображе́ний	прасто́ра адлюстрава́нняў
— паракомпа́ктное	прасто́ра паракампа́ктная
— пе́ристое	прасто́ра пёрыстая
— пе́тель	прасто́ра пе́тляў
— пло́ское	прасто́ра пло́ская
— полиэ́дра	прасто́ра паліэ́дра
— по́лное	прасто́ра по́ўная
— полугиперболи́ческое	прасто́ра паўгіпербалі́чная
— полуевкли́дово	прасто́ра паўэўклі́дава
— полунеевкли́дово	прасто́ра паўнеэўклі́дава
— полупсевдоевкли́дово	прасто́ра паўпсеўдаэўклі́дава
— полупсевдори́маново	прасто́ра паўпсеўдары́манава
— полурефлекси́вное	прасто́ра паўрэфлексі́ўная
— полури́маново	прасто́ра паўры́манава
— полусимплекти́ческое	прасто́ра паўсімплекты́чная
— полуупоря́доченное	прасто́ра паўупарадкава́ная
— полуэллипти́ческое	прасто́ра паўэліпты́чная
— Понтря́гина	прасто́ра Пантра́гіна
— предги́льбертово	прасто́ра прадгі́льбертава
— преддво́йственное	прасто́ра праддваі́стая
— предкомпа́ктное	прасто́ра прадкампа́ктная
— представле́ния	прасто́ра выяўле́ння
— проекти́вное	прасто́ра праекты́ўная
— прямо́е	прасто́ра прама́я
— псевдогалиле́ево	прасто́ра псеўдагаліле́ева
— псевдокомпа́ктное	прасто́ра псеўдакампа́ктная
— псевдометри́ческое	прасто́ра псеўдаметры́чная
— псевдори́маново	прасто́ра псеўдары́манава
— Пуанкаре́	прасто́ра Пуанкарэ́
— пункти́рованное	прасто́ра пунктава́ная
— путе́й	прасто́ра шляхо́ў
— равноме́рное	прасто́ра раўнаме́рная
— радо́ново	прасто́ра радо́нава
— расслое́ния	прасто́ра расслае́ння
— расслое́нное	прасто́ра рассло́еная
— регуля́рное	прасто́ра рэгуля́рная
— редукти́вное	прасто́ра рэдукты́ўная

простра́нство репрезентати́вное	прасто́ра рэпрэзентаты́ўная
— рефлекси́вное	прасто́ра рэфлексі́ўная
— Ри́мана	прасто́ра Ры́мана
— ри́маново	прасто́ра ры́манава
— Ри́сса	прасто́ра Ры́са
— с ве́сом	прасто́ра з ваго́й
— свя́зное	прасто́ра звя́зная
— секвенциа́льное	прасто́ра секвенцы́йная
— сепара́бельное	прасто́ра сепара́бельная
— симметризу́емое	прасто́ра сіметрызава́льная
— симметри́ческое	прасто́ра сіметры́чная
— симплициа́льное	прасто́ра сімпліцы́йная
— Со́болева	прасто́ра Со́балева
— сопряжённое	прасто́ра спалу́чаная
— состоя́ний	прасто́ра ста́наў
— Сто́уна	прасто́ра Сто́ўна
— структу́рное	прасто́ра структу́рная
— субпроекти́вное	прасто́ра субпраекты́ўная
— сфери́ческое	прасто́ра сферы́чная
— счетноме́рное	прасто́ра злічонаме́рная
— счетнонорми́рованное	прасто́ра злічонаўнармава́ная
— тетра́эдра	прасто́ра тэтра́эдра
— ти́хоновское	прасто́ра ці́ханаўская
— То́ма	прасто́ра То́ма
— топологи́ческое	прасто́ра тапалагі́чная
— торови́дное	прасто́ра торападо́бная
— транснорма́льное	прасто́ра транснарма́льная
— триангули́руемое	прасто́ра трыянгуля́ва́льная
— ультраборнологи́ческое	прасто́ра ультраборналагі́чная
— ультрабо́чечное	прасто́ра ультрабо́чкавая
— универса́льное	прасто́ра універса́льная
— унита́рное	прасто́ра уніта́рная
— Урысо́на	прасто́ра Урысо́на
— фа́зовое	прасто́ра фа́завая
— фигу́ры	прасто́ра фігу́ры
— Фи́нслера	прасто́ра Фі́нслера
— фи́нслерово	прасто́ра фі́нслерава
— фла́говое	прасто́ра сця́гавая
— Фо́ка	прасто́ра Фо́ка
— фо́ковское	прасто́ра фо́каўская
— Фреше́	прасто́ра Фрэшэ́
— фу́нкций	прасто́ра фу́нкцый
— функциона́льное	прасто́ра функцыяна́льная
— Ха́рди	прасто́ра Ха́рды
— хаусдо́рфово	прасто́ра хаўсдо́рфава
— центроаффи́нное	прасто́ра цэнтраафі́нная

простра́нство числово́е	прасто́ра лі́кавая
— Шва́рца	прасто́ра Шва́рца
— Ште́йна	прасто́ра Штэ́йна
— Эйнште́йна	прасто́ра Эйнштэ́йна
— эллипти́ческое	прасто́ра эліпты́чная
— эрми́тово	прасто́ра эрмі́тава
— я́дерное	прасто́ра я́дзерная
простра́нство-вре́мя	прасто́ра-час
простра́нство-произведе́ние	прасто́ра-здабы́так
просче́т, *м.*	пралі́к, -у, -у, *м.*
просчита́ться	пралічы́цца
противодво́йственный	супрацьдваі́сты
противолежа́ть	супрацьляжа́ць
противолежа́щий	супрацьле́глы
противонапра́вленный	супрацьнакіра́ваны
противополо́жность, *ж.*	процілеглась, -і, -і, *ж.*
противополо́жный	проціле́глы
противоре́чащий	супярэ́чны
противоречи́вость, *ж.*	супярэ́члівасць, -і, -і, *ж.*
противоречи́вый	супярэ́члівы
противоре́чие, *с.*	супярэ́чнасць, -і, -і, *ж.*
противоре́чить	супярэ́чыць, пярэ́чыць
про́филь Жуко́вского	про́філь Жуко́ўскага
процеду́ра, *ж.*	працэду́ра, -ы, -ы, *ж.*
— Ги́ра	працэду́ра Гіра
процеду́ра-фу́нкция	працэду́ра-фу́нкцыя
проце́нтиль, *м.*	працэ́нтыль, -я, -і, *м.*
проце́сс авторегрессио́нный	працэ́с аўтарэгрэсі́ўны
— вероя́тностный	працэ́с імаве́рнасны
— ветвя́щийся	працэ́с галінава́ны
— ви́неровский	працэ́с ві́нераўскі
— восстановле́ния	працэ́с аднаўле́ння
— га́уссовский	працэ́с га́ўсаўскі
— диагона́льный	працэ́с дыягана́льны
— динами́ческий	працэ́с дынамі́чны
— диффу́зии	працэ́с дыфу́зіі
— диффузио́нный	працэ́с дыфузі́йны
— И́то	працэ́с І́та
— Канторо́вича	працэ́с Кантаро́віча
— конструкти́вный	працэ́с канструкты́ўны
— ма́рковский	працэ́с ма́ркаўскі
— обновля́ющий	працэ́с аднаўля́льны
— перехо́дный	працэ́с пераходны
— По́йя	працэ́с По́йя
— полума́рковский	працэ́с паўма́ркаўскі
— пуассо́новский	працэ́с пуасо́наўскі

проце́сс сепара́бельный	праце́с сапара́бельны
— скачкообра́зный	праце́с скачкападо́бны
— случа́йный	праце́с выпадко́вы
— стохасти́ческий	праце́с стахасты́чны
— фе́ллеровский	праце́с фе́лераўскі
— эпиде́мии	праце́с эпідэ́міі
— Ю́ла	праце́с Ю́ла
проце́ссор диагона́льный	праце́сар дыягана́льны
— программи́рующий	праце́сар праграмава́льны
— ша́говый	праце́сар кро́кавы
пряма́я, ***ж.***	прама́я, -ой, -ой, *ж.*
— аналити́ческая	прама́я аналіты́чная
— гиперболи́ческая	прама́я гіпербалі́чная
— голомо́рфности	прама́я галамо́рфнасці
— Демуле́на	прама́я Дэмуле́на
— изотро́пная	прама́я ізатро́пная
— компле́ксная	прама́я камплє́ксная
— метри́ческая	прама́я метры́чная
— неархиме́дова	прама́я неархіме́дава
— несо́бственная	прама́я няўла́сная
— опо́рная	прама́я апо́рная
— параболи́ческая	прама́я парабалі́чная
— Паска́ля	прама́я Паска́ля
— проекти́вная	прама́я праекты́ўная
— регре́ссии	прама́я рэгрэ́сіі
— Ри́мана	прама́я Ры́мана
— фундамента́льная	прама́я фундамента́льная
— числова́я	прама́я лі́кавая
— Э́йлера	прама́я Э́йлера
— эллипти́ческая	прама́я эліпты́чная
прямоуго́льник, ***м.***	прамавуго́льнік, -а, -у, *м.*
— измери́мый	прамавуго́льнік выме́рны
— лати́нский	прамавуго́льнік лаці́нскі
прямоуго́льный	прамавуго́льны
прямы́е антипаралле́льные	прамы́я антыпарале́льныя
— гиперболи́ческие	прамы́я гіпербалі́чныя
— гиперпаралле́льные	прамы́я гіперпарале́льныя
— изотро́пные	прамы́я ізатро́пныя
— параболи́ческие	прамы́я парабалі́чныя
— паралле́льные	прамы́я парале́льныя
— паратакти́чные	прамы́я паратакты́чныя
— пересека́ющиеся	прамы́я перасе́чныя
— перпендикуля́рные	прамы́я перпендыкуля́рныя
— равноотстоя́щие	прамы́я роўнааддда́леныя
— расходя́щиеся	прамы́я разбе́жныя
— скре́щивающиеся	прамы́я крыжава́ныя

прямы́е эллипти́ческие	прамы́я эліпты́чныя
псевдоавтоморфи́зм, *м.*	псеўдааўтамарфі́зм, -у, -е, *м.*
псевдоба́за, *ж.*	псеўдаба́за, -ы, -е, *ж.*
псевдове́ктор, *м.*	псеўдаве́ктар, -а, -ы, *м.*
псевдово́гнутость, *ж.*	псеўдаўвагну́тасць, -і, -і, *ж.*
псевдогра́ф, *м.*	псеўдагра́ф, -а, -е, *м.*
псевдогру́ппа, *ж.*	псеўдагру́па, -ы, -е, *ж.*
— определя́ющая	псеўдагру́па вызнача́льная
псевдодискримина́нт, *м.*	псеўдадыскрыміна́нт, -а, -це, *м.*
псевдодифференциа́льный	псеўдадыферэнцыя́льны
псевдодополне́ние, *с.*	псеўдадапаўне́нне, -я, -і, *н.* *(действие)*, псеўдададатак, -у, -у, *м.* *(результат)*
— относи́тельное	псеўдадапаўне́ннне адно́снае
псевдодуга́, *ж.*	псеўдадуга́, -і, -зе, *ж.*
псевдолока́льность, *ж.*	псеўдалака́льнасць, -і, -і, *ж.*
псевдоме́трика, *ж.*	псеўдаме́трыка, -і, -цы, *ж.*
псевдомногообра́зие, *с.*	псеўдамнагаста́йнасць, -і, -і, *ж.*
псевдонорми́рование, *с.*	псеўданармава́нне, -я, -і, *н.*
псевдоотраже́ние, *с.*	псеўдаадлюстрава́нне, -я, -і, *н.*
псевдора́зность, *ж.*	псеўдаро́знасць, -ці, -ці, *ж.*
псевдорасстоя́ние аффи́нное	псеўдаадле́гласць афі́нная
— гиперболи́ческое	псеўдаадле́гласць гіпербалі́чная
— эллипти́ческое	псеўдаадле́гласць эліпты́чная
псевдоскаля́р, *м.*	псеўдаскаля́р, -а, -ы, *м.*
псевдоспира́ль, *ж.*	псеўдаспіра́ль, -і, -і, *ж.*
псевдосфе́ра	псеўдасфе́ра, -ы, -ы, *ж.*
псевдоте́нзор, *м.*	псеўдатэ́нзар, -а, -ы, *м.*
псевдохара́ктер, *м.*	псеўдахара́ктар, -у, -ы, *м.*
пульвериза́ция, *ж.*	пульверыза́цыя, -і, -і, *ж.*
пункти́рованный	пунктава́ны
пусто́й	пусты́
путь, *м.*	шлях, -у, -у, *м.*
— дезориенти́рующий	шлях дэзарыенто́ўны
— крити́ческий	шлях крытычны
— многоуго́льный	шлях многавуго́льны
— ориенти́руемый	шлях арыентава́льны
пучо́к, *м.*	пучо́к, -а, -у, *м.*
— аналити́ческий	пучо́к аналіты́чны
— вя́лый	пучо́к вя́лы
— гармони́ческий	пучо́к гармані́чны
— гипергармони́ческий	пучо́к гіпергармані́чны
— дифференциа́льный	пучо́к дыферэнцыя́льны
— каса́тельный	пучо́к даты́чны
— квазикогере́нтный	пучо́к квазікагерэ́нтны

пучóк когерéнтный	пучóк кагерэ́нтны
— конструкти́вный	пучóк канструкты́ўны
— кругóв	пучóк кругóў
— лакунáрный	пучóк лакунáрны
— мнóжеств	пучóк мнóстваў
— мя́гкий	пучóк мя́ккі
— нормáльный	пучóк нармáльны
— оби́льный	пучóк багáты
— обрати́мый	пучóк абарачáльны
— окрýжностей	пучóк акрýжнасцей
— ориенти́руемый	пучóк арыентавáльны
— ориенти́рующий	пучóк арыентóўны
— плóскостей	пучóк плóскасцей
— прямы́х	пучóк прамы́х
— структýрный	пучóк структýрны
— сфéр	пучóк сфéраў
— тóнкий	пучóк тóнкі
— Фрешé	пучóк Фрэшэ́
— фýнкций	пучóк фýнкцый
— я́дерный	пучóк я́дзерны
— якóбиев	пучóк якóбіеў
пфаффиáн, *м.*	пфафія́н, -у, -е, *м.*
пятери́чный	пяцяркóвы
пятисторóнник, *м.*	пяцістарóннік, -а, -у, *м.*

Р

рáвенство, *с.*	рóўнасць, -і, -і, *ж.*
— Парсевáля	рóўнасць Парсевáля
равнобóчный	роўнабакóвы
равновели́кие	роўнавялі́кія
равновéсие, *с.*	раўнавáга, -і, -зе, *ж.*
равновéсный	раўнавáжны
равномéрность, *ж.*	раўнамéрнасць, -і, -і, *ж.*
равномéрный	раўнамéрны
равномóщность, *ж.*	роўнамагýтнасць, -і, -і, *ж.*
равноси́льность, *ж.*	раўназначнасць, -і, -і, *ж.*
радиáн, *м.*	радыя́н, -а, -е, *м.*
радикáл, *м.*	радыкáл, -а, -е, *м.*
— áлгебры	радыкáл áлгебры
— Мáльцева	радыкáл Мáльцава
— Брáуна — Маккóя	радыкáл Брáўна — Макóя
— грýппы	радыкáл грýпы
— идеáла	радыкáл ідэáлу
— квазирегуля́рный	радыкáл квазірэгуля́рны

радика́л Костри́кина	радыка́л Кастры́кіна
— Леви́цкого	радыка́л Ляві́цкага
— насле́дственный	радыка́л спа́дчынны
— нильпоте́нтный	радыка́л нільпатэ́нтны
— обобщённый	радыка́л абагу́льнены
— прима́рный	радыка́л прыма́рны
— специа́льный	радыка́л спецыя́льны
— терциа́рный	радыка́л тэрцыя́рны
— унипоте́нтный	радыка́л уніпатэ́нтны
ра́диус, *м.*	ра́дыус, -а, -е, *м.*
— вну́тренний	ра́дыус унутраны
— вы́пуклости	ра́дыус вы́пукласці
— звездообра́зности	ра́дыус зоркападо́бнасці
— кривизны́	ра́дыус крывізны́, ра́дыус крыві́ні
— лемниска́ты	ра́дыус лемніска́ты
— Р-ли́стности	ра́дыус *P*-лі́ставасці
— одноли́стности	ра́дыус аднал́іставасці
— окру́жности	ра́дыус акру́жнасці, ра́дыус акру́жыны
— поля́рный	ра́дыус паля́рны
— спектра́льный	ра́дыус спектра́льны
— сходи́мости	ра́дыус збе́жнасці
— чебышёвский	ра́дыус чабышо́ўскі
— ша́ра	ра́дыус ша́ра
ра́диус-ве́ктор	ра́дыус-ве́ктар
разбие́ние, *м.*	разбі́ўка, -і, -цы, *ж.*
— Дирихле́ — Вороно́го	разбі́ўка Дырыхле́ — Варано́га
— измери́мое	разбі́ўка выме́рная
— лока́льное	разбі́ўка лака́льная
— непреры́вное	разбі́ўка непары́ўная
— полунепреры́вное	разбі́ўка паўнепары́ўная
— пра́вильное	разбі́ўка пра́вільная
— простра́нства	разбі́ўка прасто́ры
— симплициа́льное	разбі́ўка сімпліцы́йная
разбо́рчивый	выра́зны, разбо́рлівы
развёрнутый	разго́рнуты
развёртка, *м.*	разго́ртка, -і, -цы, *ж.*
— криво́й	разго́ртка крыво́й
разветвлённый	разгалінава́ны
раздви́жка ди́сков	рассо́ўка ды́скаў
разде́льный	асо́бны, раздзе́льны, выра́зны
разду́тие, *с.*	разду́тасць, -і, -і, *ж.*
различа́ться	ро́зніцца, адро́зніваcца
различа́ющая, *ж.*	адро́знівальная, -ай, -ай, *ж.*

разли́чие, *с.*	ро́зніца, -ы, -ы, *ж.*, адро́зненне, -я, -і, *н.*
разложе́ние, *с.*	раскладанне, -я, -і *(працэс)*, раскла́д, -у, -дзе *(рэзультат)*
разложе́ние асимптоти́ческое	раскла́д асімптаты́чны
— Брюа́	раскла́д Бруа́
— Ве́йля	раскла́д Ве́йля
— весово́е	раскла́д ва́гавы
— вириа́льное	раскла́д вірыя́льны
— Ви́тта	раскла́д Ві́та
— Га́усса	раскла́д Га́ўса
— гру́ппы	раскла́д гру́пы
— дека́ртово	раскла́д дэка́ртавы
— едини́цы	раскла́д адзі́нкі
— Жорда́на	раскла́д Жарда́на
— Ивеса́вы	раскла́д Івеса́вы
— Карта́на	раскла́д Карта́на
— Ка́рунена — Ло́эва	раскла́д Ка́рунена — Ло́эва
— Ко́рниша — Фи́шера	раскла́д Ко́рніша — Фі́шэра
— Лебе́га	раскла́д Лебе́га
— Леви́ — Ма́льцева	раскла́д Леві́ — Ма́льцава
— Ле́фшеца	раскла́д Ле́фшэца
— Ми́ттаг-Лёффлера	раскла́д Мі́таг-Лёфлера
— на мно́жители	раскладанне на мно́жнікі
— орбита́льное	раскладанне арбіта́льнае
— пи́рсовское	раскла́д пірсаўскі
— по ба́зису	раскладанне па ба́зісу
— поля́рное	раскладанне паля́рнае
— прима́рное	раскладанне прыма́рнае
— Пюизё	раскла́д Пюізё
— спектра́льное	раскладанне спектра́льнае
— Фи́ттинга	раскла́д Фі́тынга
— Ха́на	раскла́д Ха́на
— Хо́джа	раскла́д Хо́джа
— Ште́йнера	раскла́д Штэ́йнера
разложи́мый	раскла́дальны
разма́х вы́борки	разма́х вы́баркі
— стьюдентизи́рованный	разма́х ст'юдэнтызава́ны
разме́р крите́рия	паме́р крытэ́рыю
разме́рностный	выме́рны
разме́рность алгебраи́ческая	выме́рнасць алгебраі́чная
— простра́нства	выме́рнасць прасто́ры
— ба́зисная	выме́рнасць ба́зісная
— вло́жения	выме́рнасць уклада́ння
— ги́льбертова	выме́рнасць гі́льбертава

разме́рность гомологи́ческая	выме́рнасць гамалагі́чная
— дифференциа́ла	выме́рнасць дыферэнцыя́ла
— индукти́вная	выме́рнасць індукты́ўная
— инъекти́вная	выме́рнасць ін'екты́ўная
— ка́рты	выме́рнасць ка́рты
— каса́тельная	выме́рнасць даты́чная
— класси́ческая	выме́рнасць класі́чная
— когомологи́ческая	выме́рнасць кагамалагі́чная
— Кода́йры	выме́рнасць Када́іры
— компа́кта	выме́рнасць кампа́кта
— компле́ксная	выме́рнасць камплексная
— Лебе́га	выме́рнасць Лебе́га
— лебе́гова	выме́рнасць лебе́гава
— лока́льная	выме́рнасць лака́льная
— метри́ческая	выме́рнасць метры́чная
— овра́га	выме́рнасць я́ра
— полиэ́дра	выме́рнасць паліэ́дра
— по́ля	выме́рнасць по́ля
— представле́ния	выме́рнасць выяўле́ння
— проекти́вная	выме́рнасць праекты́ўная
— простра́нства	выме́рнасць прасто́ры
— расслое́ния	выме́рнасць расслае́ння
— решета́	выме́рнасць рэ́шата
— решётки	выме́рнасць кра́таў
— си́мплекса	выме́рнасць сі́мплекса
— слое́ния	выме́рнасць слае́ння
— стаби́льная	выме́рнасць стабі́льная
— супермногообра́зия	выме́рнасць супермнагаста́йнасці
— суперпростра́нства	выме́рнасць суперпрасто́ры
размеща́ть	размяшча́ць
размеще́ние, *с.*	размяшчэ́нне, -я, -і, *н.*
— полиномиа́льное	размяшчэ́нне паліно́мнае
— случа́йное	размяшчэ́нне выпадко́вае
размеще́ния зада́ча	размяшчэ́ння зада́ча
размыка́ющий	размыка́льны
размышле́ние, *с.*	ро́здум, -у, -е, *м.*, разва́га, -і, -зе, *ж.*
ра́зностный	ро́знасны
ра́зность, *ж.*	ро́знасць, -і, -і, *ж.*, ро́зніца, -ы, -ы, *ж.*
— ве́кторов	ро́знасць ве́ктараў
— коне́чная	ро́знасць кане́чная
— мно́жеств	ро́знасць мно́стваў
— симметри́ческая	ро́знасць сіметры́чная
— центра́льная	ро́знасць цэнтра́льная

ра́зность чи́сел	ро́знасць лі́каў
разре́женность мно́жества	разрэ́джанасць мно́ства
разре́з, *м.*	разрэ́з, -у, -е, *м.*
— в гра́фе	разрэ́з у гра́фе
— канони́ческий	разрэ́з канані́чны
— цикли́ческий	разрэ́з цыклі́чны
разреша́ющий	які выраша́е
разреше́ние осо́бенностей	выраша́нне асаблі́васцей
разреши́мый	выраша́льны
разры́вный	разры́ўны
ранг, *м.*	ранг, -у, -у, *м.*
— ма́трицы	ранг ма́трыцы
— многообра́зия	ранг мнагаста́йнасці
— мно́жества	ранг мно́ства
— мо́дуля	ранг мо́дуля
— норми́рования	ранг нармава́ння
— отноше́ния	ранг дачыне́ння
— полицикли́ческий	ранг поліцыклі́чны
— полупросто́й	ранг паўпро́сты
— простра́нства	ранг прасто́ры
— расслое́ния	ранг расслае́ння
— редукти́вный	ранг рэдукты́ўны
— решётки	ранг кра́таў
— стаби́льный	ранг стабі́льны
— фигу́ры	ранг фігу́ры
рандомиза́ция, *ж.*	рандамізá́цыя, -і, -і, *ж.*
раскра́ска гра́фа	расфарбо́ўка гра́фа
раскрыва́ть	раскрыва́ць
раскры́тие неопределённостей	раскрыццё нявы́значанасцей
распознава́ние о́бразов	распазнава́нне во́бразаў
распознава́тель коне́чный	распазнава́льнік кане́чны
распределе́ние, *с.*	размеркава́нне, -я, -і, *н.*
— апостерио́рное	размеркава́нне апастэрыё́рнае
— априо́рное	размеркава́нне апрыё́рнае
— арифмети́ческое	размеркава́нне арыфметы́чнае
— аркси́нуса	размеркава́нне аркс́інуса
— атоми́ческое	размеркава́нне атамі́чнае
— Берну́лли	размеркава́нне Берну́лі
— бимода́льное	размеркава́нне бімада́льнае
— Бо́льцмана	размеркава́нне Бо́льцмана
— Ве́йбулла	размеркава́нне Ве́йбула
— вероя́тностей	размеркава́нне імаве́рнасцей
— вероя́тностное	размеркава́нне імаве́рнаснае
— вы́борки	размеркава́нне вы́баркі
— вы́рожденное	размеркава́нне вы́раджанае (звыро́днае)

распределе́ние Га́усса — Лапла́са	размеркава́нне Га́ўса — Лапла́са
— **геометри́ческое**	размеркава́нне геаметры́чнае
— **Ги́ббса**	размеркава́нне Гі́бса
— **гипергеометри́ческое**	размеркава́нне гіпергеаметры́чнае
— **гипотети́ческое**	размеркава́нне гіпатэты́чнае
— **горизонта́льное**	размеркава́нне гарызанта́льнае
— **двухверши́нное**	размеркава́нне двухвяршы́ннае
— **Дирихле́**	размеркава́нне Дырыхле́
— **дискре́тное**	размеркава́нне дыскрэ́тнае
— **инволюти́вное**	размеркава́нне інвалюты́ўнае
— **ка́нторово**	размеркава́нне ка́нтарава
— **Колмого́рова**	размеркава́нне Калмаго́рава
— **конечноме́рное**	размеркава́нне канечнаме́рнае
— **Коши́**	размеркава́нне Кашы́
— **Лапла́са**	размеркава́нне Лапла́са (Ляпля́са)
— **логисти́ческое**	размеркава́нне лагісты́чнае
— **логнорма́льное**	размеркава́нне логнарма́льнае
— **Ма́ксвелла**	размеркава́нне Ма́ксвела
— **Ма́ксвелла — Бо́льцмана**	размеркава́нне Ма́ксвела — Бо́льцмана
— **маргина́льное**	размеркава́нне маргіна́льнае
— **микроканони́ческое**	размеркава́нне мікракананíчнае
— **многоверши́нное**	размеркава́нне многавяршы́невае
— **многоме́рное**	размеркава́нне мнагаме́рнае
— **мультимода́льное**	размеркава́нне мультымада́льнае
— **мультиномина́льное**	размеркава́нне мультынаміна́льнае
— **невы́рожденное**	размеркава́нне нявы́раджанае
— **непреры́вное**	размеркава́нне непары́ўнае
— **неразложи́мое**	размеркава́нне нераскладáльнае
— **несо́бственное**	размеркава́нне няўла́снае
— **норма́льное**	размеркава́нне нарма́льнае
— **одноверши́нное**	размеркава́нне аднавяршы́невае
— **Паре́то**	размеркава́нне Парэ́та
— **Паска́ля**	размеркава́нне Паска́ля

распределе́ние Пи́рсона	размеркава́нне Пі́рсана
— По́йа	размеркава́нне По́йа
— показа́тельное	размеркава́нне пака́знікавае
— полиномиа́льное	размеркава́нне паліно́мнае
— прямоуго́льное	размеркава́нне прамавуго́льнае
— Пуассо́на	размеркава́нне Пуасо́на
— равнове́сное	размеркава́нне інварыя́нтнае
— равноме́рное	размеркава́нне раўнаме́рнае
— решётчатое	размеркава́нне кра́тавае
— Рэле́я	размеркава́нне Рэле́я
— сингуля́рное	размеркава́нне сінгуля́рнае
— Снедеко́ра	размеркава́нне Снедэко́ра
— со́бственное	размеркава́нне ўла́снае
— совме́стное	размеркава́нне супо́льнае
— стациона́рное	размеркава́нне стацыяна́рнае
— Стью́дента	размеркава́нне Ст'ю́дэнта
— треуго́льное	размеркава́нне трохвуго́льнае
— Уи́шарта	размеркава́нне Уі́шарта
— унимода́льное	размеркава́нне унімада́льнае
— усечённое	размеркава́нне ссе́чанае
— усло́вное	размеркава́нне ўмо́ўнае
— усто́йчивое	размеркава́нне ўсто́йлівае
— фидуциа́льное	размеркава́нне фідуцы́йнае
— Фи́шера — Снедеко́ра	размеркава́нне Фі́шара — Снедэко́ра
— хи-квадра́т	размеркава́нне хі-квадра́т
— ча́стное	размеркава́нне частко́вае
— Шарлье́	размеркава́нне Шарлье́
— экспоненциа́льное	размеркава́нне экспаненцы́йнае
— эмпири́ческое	размеркава́нне эмпіры́чнае
— Э́рланга	размеркава́нне Э́рланга
распредели́тельность, *ж.*	размеркава́льнасць, -і, -і, *ж.*
распредели́тельный	размеркава́льны
распределя́ть	размяркоўваць
рассе́ивание вы́борки	рассе́йванне вы́баркі
расслабле́ние, *с.*	расслабле́нне, -я, -і, *н.*
расслое́ние, *с.*	расслае́нне, -я, -і, *н.*
— ве́кторное	расслае́нне ве́ктарнае
— гла́вное	расслае́нне гало́ўнае
— голомо́рфное	расслае́нне галамо́рфнае
— Гуре́вича	расслае́нне Гурэ́віча
— евкли́дово	расслае́нне эўклі́дава

расслое́ние Зе́йферта	расслае́нне Зе́йферта
— индуци́рованное	расслае́нне індукава́нае
— каса́тельное	расслае́нне даты́чнае
— кокаса́тельное	расслае́нне кадаты́чнае
— корепе́ров	расслае́нне карэпе́раў
— норма́льное	расслае́нне нарма́льнае
— одноро́дное	расслае́нне аднаро́днае
— ориенти́рованное	расслае́нне арыентава́нае
— ориенти́руемое	расслае́нне арыентава́льнае
— отрица́тельное	расслае́нне адмо́ўнае
— положи́тельное	расслае́нне дада́тнае
— проекти́вное	расслае́нне праекты́ўнае
— структу́рное	расслае́нне структу́рнае
— те́нзорное	расслае́нне тэ́нзарнае
— Ти́тса	расслае́нне Ты́тса
— универса́льное	расслае́нне універса́льнае
— Хо́пфа	расслае́нне Хо́пфа
рассма́тривать	разгляда́ць
рассмотре́ние, *с.*	разгля́д, -у, -дзе, *м.*
расстоя́ние аффи́нное	адле́гласць афі́нная
— Безико́вича	адле́гласць Безіко́віча
— Ве́йля	адле́гласць Ве́йля
— геодези́ческое	адле́гласць геадэзі́чная
— гиперболи́ческое	адле́гласць гіпербалі́чная
— информацио́нное	адле́гласць інфармацы́йная
— ко́довое	адле́гласць ко́давая
— на мно́жестве	адле́гласць на мно́стве
— неевкли́дово	адле́гласць неэўклі́дава
— поля́рное	адле́гласць паля́рная
— по Фреше́	адле́гласць паво́дле Фрэшэ́
— Степа́нова	адле́гласць Сцяпа́нава
— сфери́ческое	адле́гласць сферы́чная
— фо́кусное	адле́гласць фо́кусная
— Хе́минга	адле́гласць Хе́мінга
— хорда́льное	адле́гласць харда́льная
рассро́йка, *ж.*	разбудо́ўка, -і, -ы, *ж.*
растя́гивающий	расця́гвальны
растяже́ние, *с.*	расця́гванне, -я, -і, *н.*
расходя́щийся	разбе́жны
расхожде́ние, *с.*	разбе́г, -у, -у, *м.*
расшире́ние а́белево	пашырэ́нне а́белева
— соверше́нное	пашырэ́нне даскана́лае
— гру́ппы	пашырэ́нне гру́пы
— кругово́е	пашырэ́нне кругаво́е
— Ку́ммера	пашырэ́нне Ку́мера
— мо́дуля	пашырэ́нне мо́дуля

расшире́ние неразветвлённое	пашырэ́нне неразгалінава́нае
— отображе́ния	пашырэ́нне адлюстрава́ння
— по́ля	пашырэ́нне по́ля
расщепи́мый	расшчапля́льны
расщепля́емость после́довательности	расшчапля́льнасць паслядо́ўнасці
рациона́льный	рацыяна́льны
реализа́ция сужде́ния	рэаліза́цыя суджэ́ння, рэаліза́цыя меркава́ння
реализу́емость, *ж.*	рэалізава́льнасць, -і, -і, *ж.*
— рекурси́вная	рэалізава́льнасць рэкурсі́ўная
— возвра́та	рэалізава́льнасць звaро́ту
ребро́ многогра́нника	кант мнагагра́нніка
— возвра́та	кант звaро́ту
регрессио́нный	рэгрэсі́ўны
регре́ссия, *м.*	рэгрэ́сія, -і, -і, *ж.*
— криволине́йная	рэгрэ́сія крываліне́йная
— лине́йная	рэгрэ́сія ліне́йная
— мно́жественная	рэгрэ́сія мно́жнасная
— нелине́йная	рэгрэ́сія неліне́йная
— параболи́ческая	рэгрэ́сія парабалі́чная
— полиномиа́льная	рэгрэ́сія паліно́мная
регре́ссор, *м.*	рэгрэ́сар, -а, -ы, *м.*
регуляриза́ция, *ж.*	рэгулярыза́цыя, -і, -і, *ж.*
регуляризи́рующий	рэгулярызо́ўны
регуляризо́ванный	рэгулярызава́ны
регуля́рный	рэгуля́рны
регуля́тор	рэгуля́тар, -а, -ы, *м.*
редукти́вный	рэдукты́ўны
реду́кция Ва́льда	рэду́кцыя Ва́льда
режи́м бие́ний	рэжы́м біе́нняў
резерви́рование, *с.*	рэзервава́нне, -я, -і, *н.*
резольве́нта, *ж.*	рэзальве́нта, -ы, -це, *ж.*
— асимптоти́ческая	рэзальве́нта асімптаты́чная
резона́нс, *м.*	рэзана́нс, -у, -е, *м.*
— комбинацио́нный	рэзана́нс камбінацы́йны
— основно́й	рэзана́нс асно́ўны
— параметри́ческий	рэзана́нс параметры́чны
результа́нт многочле́нов	рэзульта́нт мнагаскла́даў
результи́рующий	выніко́вы, рэзультаты́ўны
рекурре́нтность цепна́я	рэкурэ́нтнасць ланцуго́вая
рекурси́вность относи́тельная	рэкурсі́ўнасць параўна́льная
рекурси́вный	рэкурсі́ўны
реку́рсия, *ж.*	рэку́рсія, -і, -і, *ж.*
— многокра́тная	рэку́рсія многаразо́вая
— примити́вная	рэку́рсія прыміты́ўная

рекýрсия трансфинúтная	рэкýрсія трансфíнітная
релаксациóнный	рэлаксацыйны
релаксáция, *ж.*	рэлаксáцыя, -і, -і, *ж.*
рельéф аналитúческий	рэльéф аналітычны
релятивúстский	рэлятывíсцкі
релятúвный	рэлятыўны
реляциóнный	рэляцыйны
ремонтоприспосóбленность, *ж.*	рамонтапрыстасавáнасць, -і, -і, *ж.*
репéр, *м.*	рэпéр, -а, -ы, *м.*
— аффúнный	рэпéр афíнны
— канонúческий	рэпéр кананíчны
— натурáльный	рэпéр натурáльны
— полуканонúческий	рэпéр паўкананíчны
— примитúвный	рэпéр прымітыўны
— прострáнства	рэпéр прастóры
— сопровождáющий	рэпéр суправаджáльны
— Френé	рэпéр Фрэнэ́
репрезентатúвный	рэпрэзентатыўны
ретрáкция, *ж.*	рэтрáкцыя, -і, -і, *ж.*
рефлексúвность, *ж.*	рэфлексíўнасць, -і, -і, *ж.*
рефлектúвный	рэфлектыўны
рецензúровать	рэцэнзавáць
решáть	рашáць, вырашáць, развязваць
решéние, *с.*	рашэ́нне, -я, -і, *н.*, развязак, -а, -у, *м.*
— гетероклинúческое	рашэ́нне гетэраклінíчнае
— гомоклинúческое	рашэ́нне гомаклінíчнае
— допустúмое	рашэ́нне дапушчáльнае
— Иóста	рашэ́нне Іóста
— колéблющееся	рашэ́нне хíсткае
— óбщее	рашэ́нне агýльнае
— оптимáльное	рашэ́нне аптымáльнае
— ослáбленное	рашэ́нне аслáбленае
— осóбое	рашэ́нне асаблíвае, рашэ́нне адмéтнае
— периодúческое	рашэ́нне перыядычнае
— регуляризúрованное	рашэ́нне рэгулярызавáнае
— чáстное	рашэ́нне часткóвае
решéтка, *ж.*	крáты, -аў, -ах
— алгебраúческая	крáты алгебраíчныя
— áтомная	крáты áтамныя
— бáнахова	крáты бáнахавы
— Бравé	крáты Бравé
— бýлева	крáты бýлевы
— подáлгебр	крáты падáлгебраў

решетка с дополне́ниями	кра́ты з дапаўне́ннямі
решето́ Бру́но	рэ́шата Бру́на
реше́тчатый	кра́тавы
риск бе́йесовский	рызы́ка бэ́йесаўская
род криво́й	род крыво́й
— пове́рхности	род паве́рхні
— произведе́ния	род здабы́тку
ро́за трохоида́льная	ру́жа трахо́ідная
ро́зы	ру́жы
ромб, *м.*	ромб, -а, -е, *м.*
ромби́ческий	рамбі́чны
рост экспоненциа́льный	рост экспаненцы́йны
росто́к, *м.*	па́растак, -тка, -тку, *м.*
— дифференциа́льный	па́растак дыферэнцыя́льны
— норма́льный	па́растак нарма́льны
— определённый	па́растак вы́значаны
— фу́нкции	па́растак фу́нкцыі
ро́тор, *м.*	ро́тар, -а, -ы, *м.*
ру́чка, *ж.*	ру́чка, -і, -ы, *ж.*
ряд, *м.*	рад, -а, -дзе, *м.* *(как последовательность)*, шэ́раг, -у, -у, *м.*
— арифмети́ческий	шэ́раг арыфметы́чны
— асимптоти́ческий	шэ́раг асімптаты́чны
— биномиа́льный	шэ́раг біно́мны
— Бю́рмана — Лагра́нжа	шэ́раг Бю́рмана — Лагра́нжа
— вариацио́нный	рад варыяцы́йны
— вириа́льный	шэ́раг вірыя́льны
— возвра́тный	рад зваро́тны
— временно́й	рад ча́савы
— гармони́ческий	шэ́раг гармані́чны
— Га́ртогса	шэ́раг Га́ртагса (Ха́ртагса)
— Га́ртогса — Лора́на	шэ́раг Га́ртагса — Лара́на
— Га́усса	шэ́раг Га́ўса
— геометри́ческий	шэ́раг геаметры́чны
— Ги́льберта — Шми́дта	шэ́раг Гі́льберта — Шмі́та
— гипергеометри́ческий	шэ́раг гіпергеаметры́чны
— гла́вный	шэ́раг гало́ўны
— Гра́ма — Шарлье́	шэ́раг Гра́ма — Шарлье́
— двойно́й	шэ́раг двайны́
— дина́мики	рад дына́мікі
— Дирихле́	шэ́раг Дырыхле́
— Его́рова	шэ́раг Яго́рава
— знакопереме́нный	шэ́раг знаказме́нны
— знакочереду́ющийся	шэ́раг знакачаргава́льны

ряд идеа́льный	шэ́раг ідэа́льны
— интегро-степенно́й	шэ́раг інтэгра-ступе́нны
— интерполяцио́нный	шэ́раг інтэрпаляцы́йны
— композицио́нный	шэ́раг кампазіцы́йны
— кра́тный	шэ́раг кра́тны
— Ку́ммера	шэ́раг Ку́мера
— Лагра́нжа	шэ́раг Лагра́нжа
— лакуна́рный	шэ́раг лакуна́рны
— Ламбе́рта	шэ́раг Ламбе́рта (Лямбе́рта)
— Ле́йбница	шэ́раг Ле́йбніца
— Лиуви́лля — Не́ймана	шэ́раг Ліўві́ля — Не́ймана
— Лора́на	шэ́раг Лара́на
— Мёбиуса	шэ́раг Мёбіуса
— Маклоре́на	шэ́раг Маклорэ́на
— Ми́щенко	шэ́раг Мі́шчанкі
— натура́льный	рад натура́льны
— Не́ймана	шэ́раг Не́ймана
— норма́льный	шэ́раг нарма́льны
— Нью́тона	шэ́раг Нью́тана
— обве́ртывающий	шэ́раг абго́ртвальны
— ортогона́льный	шэ́раг артагана́льны
— повто́рный	шэ́раг паўто́рны
— подгру́пп	рад падгру́п
— полинильпоте́нтный	шэ́раг полінільпатэ́нтны
— полицикли́ческий	шэ́раг поліцыклі́чны
— Пуанкаре́	шэ́раг Пуанкарэ́
— Пюизё	шэ́раг Пюізё
— разреши́мый	шэ́раг выраша́льны
— расходя́щийся	шэ́раг разбе́жны
— степенно́й	шэ́раг ступе́нны
— Сти́рлинга	шэ́раг Сты́рлінга
— субнорма́льный	шэ́раг субнарма́льны
— сходя́щийся	шэ́раг збе́жны
— Те́йлора	шэ́раг Тэ́йлара
— тригонометри́ческий	шэ́раг трыганаметры́чны
— универса́льный	шэ́раг універса́льны
— Фа́бера	шэ́раг Фа́бера
— Фаре́я	шэ́раг Фарэ́я
— Фредго́льма	шэ́раг Фрэдго́льма (Фрэдхо́льма)
— функциона́льный	шэ́раг функцы́йны
— Фурье́	шэ́раг Фур'е́
— Фурье́ — Бе́сселя	шэ́раг Фур'е́ — Бе́селя
— Ферье́ — Сти́лтьеса	шэ́раг Фур'е́ — Сты́лцьеса
— Фурье́ — Чебыше́ва	шэ́раг Фур'е — Чабышо́ва
— центра́льный	шэ́раг цэнтра́льны

ряд числово́й	шэ́раг лі́кавы
— шпе́ккеров	шэ́раг шпе́кераў
— Шту́рма	шэ́раг Шту́рма
— Э́джворта	шэ́раг Э́джварта
— Эйзенште́йна	шэ́раг Эйзенштэ́йна
— Э́йлера	шэ́раг Э́йлера

С

самопери́метр, *м.*	самаперы́метр, -а, -ы, *м.*
самосинхрониза́ция, *ж.*	самасінхраніза́цыя, -і, -і, *ж.*
само́ собо́й разуме́ется	само́ сабо́й зразуме́ла
самосопряжённый	самаспалу́чаны
сбаланси́рованный	збалансава́ны
свёртка те́нзора	зго́ртка тэ́нзара
— фу́нкций	зго́ртка фу́нкцый
— я́дер	зго́ртка я́драў
свёртывание те́нзоров	зго́ртванне тэ́нзараў
свёртывания теоре́тико-типо-вы́е	зго́ртванні тэарэ́тыка-тыпо́-выя
сверхсло́во, *с.*	звышсло́ва, -а, -е, *н.*
сверхсходи́мость, *ж.*	звышзбе́жнасць, -і, -і, *ж.*
све́рху	зве́рху
сверхъязык, *м.*	звышмо́ва, -ы, -е, *ж.*
свобо́дный	свабо́дны
своди́мость, *ж.*	зво́днасць, -і, -і, *ж.*
— алгоритми́ческая	зво́днасць алгарытмі́чная
— нумера́ций	зво́днасць нумара́цый
— табли́чная	зво́днасць таблі́чная
сво́йство, *с.*	уласці́васць, -і, -і, *ж.*
— архиме́дово	уласці́васць архіме́дава
— сгла́живания	уласці́васць згла́джвання
свы́ше	звыш, больш за
свя́занный	звя́заны
свя́зи двусторо́нние	су́вязі двухбако́выя
— неуде́рживающие	су́вязі няўтрыма́льныя
— односторо́нние	су́вязі аднабако́выя
— уде́рживающие	су́вязі ўтрыма́льныя
свя́зка, *ж.*	звя́зка, -і, -цы, *ж.*
— окру́жностей	звя́зка акру́жнасцей, звя́зка акру́жын
— пло́скостей	звя́зка пло́скасцей
— полугру́пп	звя́зка паўгру́п
— пропозициона́льная	звя́зка прапазіцы́йная
— прямы́х	звя́зка прамы́х
— сфер	звя́зка сфераў

свя́зности Ле́ви-Чиви́та	звя́знасці Ле́ві-Чыві́та
свя́зности на многообра́зии	звя́знасці на мнагаста́йнасці
свя́зность, *ж.*	звя́знасць, -і, -і, *ж.*
— аффи́нная	звя́знасць афі́нная
— Ве́йля	звя́знасць Ве́йля
— в катего́рии	звя́знасць у катэго́рыі
— гра́фа	звя́знасць гра́фа
— евкли́дова	звя́знасць эўклі́дава
— инфинитезима́льная	звя́знасць інфінітэзіма́льная
— канони́ческая	звя́знасць канані́чная
— Карта́на	звя́знасць Карта́на
— канфо́рмная	звя́знасць канфо́рмная
— лине́йная	звя́знасць ліне́йная
— метри́ческая	звя́знасць метры́чная
— нелине́йная	звя́знасць неліне́йная
— пло́ская	звя́знасць пло́ская
— по́лная	звя́знасць по́ўная
— проекти́вная	звя́знасць праекты́ўная
— ри́манова	звя́знасць ры́манава
— самодуа́льная	звя́знасць самадуа́льная
— симплекти́ческая	звя́знасць сімплекты́чная
— эквиаффи́нная	звя́знасць эквіафі́нная
— эрми́това	звя́знасць эрмі́тава
свя́зный	звя́зны
свя́зывающий	звя́звальны
свя́зь, *ж.*	су́вязь, -і, -і, *ж.*
— анафори́ческая	су́вязь анафары́чная
— нестациона́рная	су́вязь нестацыяна́рная
— обра́тная	су́вязь адваро́тная
— стациона́рная	су́вязь стацыяна́рная
сгла́живание угло́в	згла́джванне вугло́ў
сгла́живающий	згла́джвальны
симме́трика, *ж.*	сіме́трыка, -і, -цы, *ж.*
симметри́рование	сіметрава́нне, -я, -і, *н.*
сдвиг, *м.*	зрух, -у, -у, *м.*
— канони́ческий	зрух канані́чны
— разме́рностей	зрух выме́рнасцей
— унита́рный	зрух уніта́рны
сдви́ги полугру́пп	зру́хі паўгру́п
сегме́нт, *м.*	сегме́нт, -а, -це, *м.*
— в простра́нстве	сегме́нт у прасто́ры
— кру́га	сегме́нт кру́га
— кругово́й	сегме́нт кру́гавы
— на пло́скости	сегме́нт на пло́скасці
— шарово́й	сегме́нт шаравы́
седло́, *с.*	сядло́, -а, -е, *н.*

седло́ в бесконе́чности	сядло́ ў бяско́нцасці
седлово́й	седлавы́
седло́-у́зел, *м.*	сядло́-ву́зел, -а, -е, *м.*
се́канс, *м.*	се́канс, -а, -е, *м.*
секве́нция, *ж.*	секве́нцыя, -і, -і, *ж.*
се́ктор, *м.*	се́ктар, -а, -ы, *м.*
— в простра́нстве	се́ктар у прасто́ры
— гипербoли́ческий	се́ктар гіпербалі́чны
— кру́га	се́ктар кру́га
— кругово́й	се́ктар кругавы́
— на пло́скости	се́ктар на пло́скасці
— параболи́ческий	се́ктар парабалі́чны
— седлово́й	се́ктар седлавы́
— Фро́ммера	се́ктар Фро́мера
— шарово́й	се́ктар шаравы́
— эллипти́ческий	се́ктар эліпты́чны
секториа́льный	се́ктарны
секу́нда, *ж.*	секу́нда, -ы, -дзе, *ж.*
— метри́ческая	секу́нда метры́чная
секу́щая окру́жности	се́чная акру́жнасці, се́чная акру́жыны
сема́нтика, *ж.*	сема́нтыка, -і, -цы, *ж.*
— алгебраи́ческая	сема́нтыка алгебраі́чная
— в программи́ровании	сема́нтыка ў праграмава́нні
— денотацио́нная	сема́нтыка дэнатацы́йная
— интуициони́стская	сема́нтыка інтуіцыяні́сцкая
— конструкти́вная	сема́нтыка канструкты́ўная
— Кри́пке	сема́нтыка Кры́пке
— операцио́нная	сема́нтыка аперацы́йная
— структу́рная	сема́нтыка структу́рная
семанти́ческий	семанты́чны
семафо́р, *м.*	семафо́р, -а, -ы, *м.*
семиинвариа́нт, *м.*	семіінварыя́нт, -а, -це, *м.*
— спектра́льный	семіінварыя́нт спектра́льны
семимартинга́л, *м.*	семімартынга́л, -а, -е, *м.*
сепара́бельный	сепара́бельны
сепара́нта, *ж.*	сепара́нта, -ы, -це, *ж.*
сепаратри́са, *ж.*	сепаратры́са, -ы, -е, *ж.*
— неусто́йчивая	сепаратры́са няўсто́йлівая
— седла́	сепаратры́са сядла́
— седло́-узла́	сепаратры́са сядло́-вузла́
— усто́йчивая	сепаратры́са ўсто́йлівая
се́рии представле́ний	се́рыі выяўле́нняў
се́рия сло́ва	се́рыя сло́ва
се́ти аполя́рные	се́ткі апаля́рныя
се́тка, *ж.*	се́тка, -і, -цы, *ж.*

сеть, *ж.*	се́тка, -і, -цы, *ж.*
— автома́тная	се́тка аўтама́тная
— алгебраи́ческая	се́тка алгебраі́чная
— асимптоти́ческая	се́тка асімптаты́чная
— Бонне́	се́тка Банэ́
— виртуа́льно-асимптоти́ческая	се́тка віртуа́льна-асімптаты́чная
— геодези́ческая	се́тка геадэзі́чная
— гиперболи́ческая	се́тка гіпербалі́чная
— голоно́мная	се́тка галано́мная
— Его́рова	се́тка Яго́рава
— изотерми́ческая	се́тка ізатэрмі́чная
— итерати́вная	се́тка ітэраты́ўная
— кони́ческая	се́тка кані́чная
— конфо́рмно-геодези́ческая	се́тка канфо́рмна-геадэзі́чная
— конфо́рмно-чебыше́вская	се́тка канфо́рмна-чабышо́ўская
— Лиуви́лля	се́тка Ліўві́ля
— логи́ческая	се́тка лагі́чная
— неголоно́мная	се́тка негалано́мная
— ортогона́льная	се́тка артагана́льная
— параболи́ческая	се́тка парабалі́чная
— перено́са	се́тка перано́су
— Пе́три	се́тка Пе́тры
— потенциа́льная	се́тка патэнцыя́льная
— ромби́ческая	се́тка рамбі́чная
— сопряжённая	се́тка спалу́чаная
— сфер	се́тка сфе́раў
сече́ние, *с.*	сячэ́нне, -я, -і, *н. (действие)*, се́чыва, -а, -у, *н. (результат)*
— дедеки́ндово	се́чыва дэдэкі́ндава
— золото́е	се́чыва залато́е
— канони́ческое	сячэнне канані́чнае
— кони́ческое	се́чыва кані́чнае
— многообра́зия	се́чыва мнагаста́йнасці
— непреры́вное	ся́чэнне непары́ўнае
— норма́льное	се́чыва нарма́льнае
— нулево́е	се́чыва нулявое
— о́бласти	сячэ́нне абся́гу
— отображе́ния	сячэ́нне адлюстрава́ння
— представля́ющее	сячэ́нне ўяўля́льнае
— простра́нственное	се́чыва прасто́равае
— расслое́ния	сячэ́нне расслае́ння

сжа́тие, *с.*	сціска́нне, -я, -і, *н.*
сжима́ющий	сціска́льны
сигна́л входно́й	сігна́л уваxо́дны
— выходно́й	сігна́л выхо́дны
— телегра́фный	сігна́л тэлегра́фны
сигна́ла выделе́ние	сігна́ла вылучэ́нне
сигнату́ра, *ж.*	сігнату́ра, -ы, -ы, *ж.*
— Минко́вского	сігнату́ра Мінко́ўскага
— многообра́зия	сігнату́ра мнагаста́йнасці
си́гнум, *м.*	сі́гнум, -а, -е, *м.*
сизи́гия, *ж.*	сізі́гія, -і, -і, *ж.*
си́мвол, *м.*	сі́мвал, -а, -е, *м.*
— А́ртина	сі́мвал А́ртына
— Ве́йля	сі́мвал Ве́йля
— ви́ковский	сі́мвал ві́каўскі
— вну́тренний	сі́мвал уну́траны
— вспомога́тельный	сі́мвал дапамо́жны
— грани́чный	сі́мвал краявы́
— ко́мплекса	сі́мвал ко́мплексу
— Кристо́ффеля	сі́мвал Крысто́феля
— Кро́некера	сі́мвал Кро́нэкера
— Лежа́ндра	сі́мвал Лежа́ндра
— нача́льный	сі́мвал пачатко́вы
— нетермина́льный	сі́мвал нетэрміна́льны
— опера́тора	сі́мвал апера́тара
симметриза́тор Ю́нга	сіметрыза́тар Ю́нга
симметриза́ция, *ж.*	сіметрыза́цыя, -і, -і, *ж.*
— кругова́я	сіметрыза́цыя кру́гавая
симметризу́емый	сіметрызава́льны
си́мплекс, *м.*	сі́мплекс, -а, -е, *м.*
— вы́рожденный	сі́мплекс вы́раджаны, сі́мплекс звыро́дны
— геометри́ческий	сі́мплекс геаметры́чны
— евкли́дов	сі́мплекс эўклі́давы
— ориенти́рованный	сі́мплекс арыентава́ны
— станда́ртный	сі́мплекс станда́ртны
— топологи́ческий	сі́мплекс тапалагі́чны
— фундамента́льный	сі́мплекс фундамента́льны
— Шоке́	сі́мплекс Шаке́
— Эйленбе́рга — Зи́льберга	сі́мплекс Эйленбе́рга — Зі́льберга
си́мплексный	сі́мплексны
сингуля́рный	сінгуля́рны
сино́ним, *м.*	сіно́нім, -а, -е, *м.*
синоними́я, *ж.*	сінанімі́я, -і, -і, *ж.*

си́нус, *м.*	сі́нус, -а, -е, *м.*
— амплиту́ды	сі́нус амплітýды
— гиперболи́ческий	сі́нус гіпербалі́чны
— интегра́льный	сі́нус інтэгра́льны
— эллипти́ческий	сі́нус эліпты́чны
си́нусов теоре́ма	сі́нусаў тэарэ́ма
синусо́ида, *ж.*	сінусо́іда, -ы, -дзе, *ж.*
си́нус-преобразова́ние Фурье́	сі́нус-пераўтварэ́нне Фур'е́
синхрониза́ция принуди́тельная	сінхраніза́цыя прымусо́вая
систе́ма	сістэ́ма, -ы, -е, *ж.*
— Ба́наха	сістэ́ма Ба́наха
— бушу́ющая	сістэ́ма бушава́льная
— га́мильтонова	сістэ́ма га́мільтанава
— Гжего́рчика	сістэ́ма Гжэго́рчыка
— гиперкомпле́ксная	сістэ́ма гіперкампле́ксная
— гомотопи́ческая	сістэ́ма граматапі́чная
— динами́ческая	сістэ́ма дынамі́чная
— дискре́тная	сістэ́ма дыскрэ́тная
— диссипати́вная	сістэ́ма дысіпаты́ўная
— дифференциа́льная	сістэ́ма дыферэнцыя́льная
— дре́йфовая	сістэ́ма дрэ́йфавая
— за́мкнутая	сістэ́ма замкну́тая
— импримити́вности	сістэ́ма імпрымі́ты́ўнасці
— инволюцио́нная	сістэ́ма інвалюцы́йная
— интегри́руемая	сістэ́ма інтэграва́льная
— инфраинвариа́нтная	сістэ́ма інфраінварыя́нтная
— инциде́нтности	сістэ́ма інцыдэ́нтнасці
— квазилине́йная	сістэ́ма квазіліне́йная
— консервати́вная	сістэ́ма кансерваты́ўная
— корнева́я	сістэ́ма каранёвая
— лакуна́рная	сістэ́ма лакуна́рная
— лине́йная	сістэ́ма ліне́йная
— мультипликати́вная	сістэ́ма мультыплікаты́ўная
— натура́льная	сістэ́ма натура́льная
— неголоно́мная	сістэ́ма негалано́мная
— недеза́ргова	сістэ́ма недэза́ргава
— недоопределе́нная	сістэ́ма недавы́значаная
— неза́мкнутая	сістэ́ма незамкну́тая
— нелине́йная	сістэ́ма неліне́йная
— нера́венств	сістэ́ма няро́ўнасцей
— несовмести́мая	сістэ́ма несумяшча́льная
— норми́рованная	сістэ́ма ўнармава́ная
— обра́тная	сістэ́ма адваро́тная
— операцио́нная	сістэ́ма аперацы́йная
— ортогона́льная	сістэ́ма артагана́льная

систе́ма ортонорми́рованная	сістэ́ма артаўнармава́ная
— отсчёта	сістэ́ма адлі́ку
— переопределённая	сістэ́ма перавы́значаная
— перехо́дная	сістэ́ма перахо́дная
— подстано́вок	сістэ́ма падстано́вак
— По́стникова	сістэ́ма По́стнікава
— присоединённая	сістэ́ма далу́чаная
— противоречи́вая	сістэ́ма супярэ́члівая
— Пфа́ффа	сістэ́ма Пфа́фа
— Радема́хера	сістэ́ма Радэма́хера
— реляцио́нная	сістэ́ма рэляцы́йная
— Ри́сса	сістэ́ма Ры́са
— Ти́тса	сістэ́ма Ты́тса
— трансверса́льная	сістэ́ма трансверса́льная
— Уо́лша	сістэ́ма Уо́лша
— уравне́ний	сістэ́ма раўна́нняў
— форма́льная	сістэ́ма фарма́льная
— Фра́нклина	сістэ́ма Фра́нкліна
— Чебышёва	сістэ́ма Чабышо́ва
ситуа́ция равнове́сия	сітуа́цыя раўнава́гі
— элемента́рная	сітуа́цыя элемента́рная
скаля́р, *м.*	скаля́р, -а, -ы, *м.*
скаля́рный	скаля́рны
скани́рование, *с.*	сканава́нне, -я, -і, *н.*
скачо́к, *м.*	скачо́к, -чка, -чку, *м.*
скеле́т катего́рии	шкіле́т катэго́рыі
скла́дка, *ж.*	скла́дка, -і, -цы, *ж.*
скла́дывать	склада́ць, скла́дваць
ско́бка Лагра́нжа	ду́жка Лагра́нжа (Лягра́нжа)
— Ли	ду́жка Лі
— Ма́йера	ду́жка Ма́йера
— Пуассо́на	ду́жка Пуасо́на
— Яко́би	ду́жка Яко́бі
скольже́ние, *с.*	слі́зганне, -я, -і, *н.*
сколь уго́дно бли́зко	на ко́лькі патрэ́бна блі́зка, як заўго́дна блі́зка, як патрэ́бна блі́зка
ско́ро	ху́тка
ско́рость группова́я	ху́ткасць групава́я
— переда́чи	ху́ткасць перада́чы
— сходи́мости	ху́ткасць збе́жнасці
— фа́зовая	ху́ткасць фа́завая
скрещённые	скрыжава́ныя
скре́щивающиеся	крыжава́ныя
сла́бый	слабы́
слага́емое, *с.*	скла́днік, -а, -у, *м.*

след, *м.*	след, -у, -дзе, *м.*
— регуляризо́ванный	след рэгулярызава́ны
— те́нзора	след тэ́нзара
— фу́нкции	след фу́нкцыі
сле́дование семанти́ческое	вынíко́васць семанты́чная
сле́довательно	такíм чы́нам, выхо́дзіць, зна́чыць
сле́дствие, *с.*	вы́нік, -у, -у, *м.*
— логи́ческое	вы́нік лагíчны, высно́ва лагíчная
— фо́рмулы	вы́нік фо́рмулы
слова́рь, *м.*	сло́ўнік, -а, -у, *м.*
сло́во, *с.*	сло́ва, -а, -е, *н.*
— группово́е	сло́ва групаво́е
— ко́довое	сло́ва ко́давае
— несократи́мое	сло́ва нескарача́льнае
словосочета́ние, *с.*	словазлучэ́нне, -я, -і, *н.*
слое́ние, *с.*	слае́нне, -я, -і, *н.*
сложе́ние, *с.*	склада́нне, -я, -і, *н.*
— мно́жества	склада́нне мно́стваў
сло́жный	склада́ны
слой, *м.*	слой, -я, -і, *м.*, пласт, -а, -це, *м.* *(геом., физ.)*
— вихрево́й	пласт вíхравы
— геометри́ческий	пласт геаметры́чны
— кони́ческий	пласт канíчны
— морфи́зма	слой марфíзму
— пограни́чный	слой пагранíчны
— расслое́ния	слой расслае́ння
— шарово́й	пласт шаравы́
случа́йный	выпадко́вы
сме́жный	суме́жны
смеще́ние, *с.*	зрушэ́нне, -я, -і, *н.*
снару́жи	зво́нку
снача́ла	спача́тку
собира́ть	збіра́ць
со́бственный	ула́сны
собы́тие, *с.*	падзе́я, -і, -і, *ж.*, здарэ́нне, -я, -і, *н.*
— достове́рное	падзе́я верагóдная
— невозмо́жное	падзе́я немагчы́мая
— регуля́рное	падзе́я рэгуля́рная
— рекурре́нтное	падзе́я рэкурэ́нтная
— случа́йное	падзе́я выпадко́вая
— элемента́рное	падзе́я элемента́рная
соверше́нный	дасканáлы

совмести́мый	сумяшча́льны
совмеще́ние собы́тий	сумяшчэ́нне падзе́й
совпаде́ние, *с.*	супадзе́нне, -я, -і, *н.*
согласо́вывать	узгадня́ць, пагаджа́ць
содержа́ние многочле́на	змест мнагаскла́ду
содержа́ть	змяшча́ць
соедине́ние *с.*	злучэ́нне, -я, -і, *н.*
создава́ть впечатле́ние	склада́ць ура́жанне, ствара́ць ура́жанне
соизмери́мость, *ж.*	сувыме́рнасць, -і, -і, *ж.*
соквадра́ты ортогона́льные	сукwадра́ты артагана́льныя
сокраще́ние повторе́ний	скарачэ́нне паўто́раў
солито́н, *м.*	саліто́н, -а, -е, *м.*
со́лнце, *с.*	со́нца, -а, -ы, *н.*
сомно́житель, *м.*	сумно́жнік, -а, -у, *м.*
сообще́ние, *с.*	паведамле́нне, -я, -і, *н.*
сообще́ний квантова́ние	паведамле́нняў квантава́нне
соотве́тственно	адпаве́дна
соотве́тствие, *с.*	адпаве́днасць, -і, -і, *ж.*
— грани́ц	адпаве́днасць грані́ц
— изометри́ческое	адпаве́днасць ізаметры́чная
— Петерсо́на	адпаве́днасць Петэрсо́на
— поля́рное	адпаве́днасць паля́рная
— проекти́вное	адпаве́днасць праекты́ўная
соотноше́ние	судачыне́нне, -я, -і, *н.*
— Аде́ма	судачыне́нне Адэ́ма
— антикоммута́ции	судачыне́нне антыкамута́цыі
— антикоммутацио́нное	судачыне́нне антыкамутацы́йнае
— асимптоти́ческое	судачыне́нне асімптаты́чнае
— билине́йное	судачыне́нне біліне́йнае
— дефе́ктов	судачыне́нне дэфе́ктаў
— перестано́вочности	судачыне́нне перастано́ўкавасці
— поря́дка	судачыне́нне пара́дку
— равнове́сия	судачыне́нне раўнава́гі
— рекурре́нтное	судачыне́нне рэкурэ́нтнае
— Ри́мана	судачыне́нне Ры́мана
— Ша́ля	судачыне́нне Ша́ля
соприкаса́ющийся	судатыка́льны
соприкоснове́ние, *с.*	судатыка́нне, -я, -і, *н.* *(действие)*, судо́тык, -у, -у
сопровожда́ющий	суправаджа́льны
сопряже́ние, *с.*	спалучэ́нне, -я, -і, *н.*
сопряжённость гармони́ческая	спалу́чанасць гармані́чная

сопряжённый	спалу́чаны
сопу́тствующий	спадаро́жны
составля́ющий	складо́вы
составно́й	састаўны́
состоя́тельный	слу́шны
софи́зм, *м.*	сафі́зм, -а, -е, *м.*
сохране́ние	захава́нне
сочета́ние, *с.*	злучэ́нне, -я, -і, *н.*
— с повторе́нием	злучэ́нне з паўтарэ́ннем
сочета́ния алгори́тмов	злучэ́нні алгары́тмаў
сочета́тельность, *ж.*	злуча́льнасць, -і, -і, *ж.*
сочета́тельный	злуча́льны, спалуча́льны
сочлене́ние корте́жей	сучляне́нне картэ́жаў
спа́ривание, *с.*	паркава́нне, -я, -і, *н.*
— Зе́йферта	паркава́нне Зе́йферта
— Ку́ммера	паркава́нне Ку́мера
спектр, *м.*	спектр, -а, -ы, *м.*
— в катего́рии	спектр у катэго́рыі
— кольца́	спектр ко́льца
— ко́мплекса	спектр ко́мплексу
— Лагра́нжа	спектр Лагра́нжа (Лягра́нжа)
— лебе́говский	спектр лебе́гаўскі
— лока́льный	спектр лака́льны
— максима́льный	спектр максіма́льны
— Ма́ркова	спектр Ма́ркава
— ма́трицы	спектр ма́трыцы
— мо́щности	спектр магу́тнасці
— непреры́вный	спектр непары́ўны
— обра́тный	спектр адваро́тны
— опера́тор	спектр апера́тара
— оста́точный	спектр аста́ткавы
— преде́льный	спектр ліма́тавы
— проекти́вный	спектр праекты́ўны
— проекцио́нный	спектр праекцы́йны
— простра́нств	спектр прасто́раў
— прямо́й	спектр прамы́
— регре́ссии	спектр рэгрэ́сіі
— сгуще́ния	спектр згушчэ́ння
— симплициа́льный	спектр сімпліцы́йны
— сме́шанный	спектр зме́шаны
— То́ма	спектр То́ма
— то́чечный	спектр пу́нктавы
— фу́нкции	спектр фу́нкцыі
— элеме́нта	спектр элеме́нта
— энергети́ческий	спектр энергеты́чны
спектра́льный	спектра́льны

